Установа адукацыі
"Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў"

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па навуковай рабоце
________________ В.Р. Языковіч
"_9_" _студзеня_ 2020 г.
Рэгістрацыйны № ВД -_173_/эвуч.

# СОЛЬНЫЯ СПЕВЫ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне*
*для спецыяльнасці 1-16 01 10 Спевы (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-16 01 10-02 Спевы (народныя)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2020

Вучэбная праграма складзена згодна з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту Рэспублікі Беларусь ОСВО 1-16 01 10 2013, вучэбнага плана ўстановы вышэйшай адукацыі па напрамку спецыяльнасці. Рэгістрацыйны нумар С 16-1-113/19 вуч.

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**

*І.М. Грамовіч,* дэкан факультэта музычнага мастацтва ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт

*В.І. Раманенкава*, старшы выкладчык кафедры беларускай народна-песеннай творчасці ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат мастацтвазнаўства.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*кафедра* міжкультурнай камунікацыі прыватнай установы адукацыі “Інстытут сучасных ведаў імя А.М. Шырокава”;

*Т.С. Гажэўская-Пешак,* дацэнт кафедры харавокага і вакальнага мастацтва ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук, дацэнт.

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

кафедрай беларускай народна-песеннай творчасці (пратакол № 7 ад 28.02.2019 г.);

навукова-метадычным саветам ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 5 ад 19.06.2019 г.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Сольныя спевы” займае важнае месца ў комплексе прафілюючых вучэбных дысцыплін напрамку спецыяльнасці “Спевы (народныя)”. Выканаўца народнай песні павінен валодаць манерай спеваў, блізкай да носьбітаў песеннага фальклору; творча падыходзіць да вырашэння важнай праблемы сучаснасці па захаванні, развіцці і прапагандзе прагрэсіўных традыцый народна-песеннага выканальніцтва; садзейнічаць павышэнню ўзроўню вакальна-выканальніцкага майстэрства. Вучэбная дысцыпліна “Сольныя спевы” выкладаецца ва ўзаемасувязі з такімі вучэбнымі дысцыплінамі як: “Выканальніцкае майстэрства”, “Аранжыроўка і расшыфроўка народнай песні”, “Асновы сцэнічнага руху”, “Методыцы выкладання спецдысцыплін”, “Гісторыя вакальнага мастацтва”, “Беларуская народна-песенная творчасць”.

Вучэбная дысцыпліна “Сольныя спевы” павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў наступных груп кампетэнцый:

АК-1. Умець прымяняць атрыманыя навукова-тэарэтычныя веды ў практычнай дзейнасці выканаўцы і выкладчыка для вырашэння прафесійных задач.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным спараджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам пры вырашэнні праблем.

АК-13. Арыентавацца ў спецыфічных актуальных працэсах, якія адбываюцца ў музычным мастацтве.

АК-14. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-16. Мець навыкі, звязаныя з выкарыстаннем тэхнічных прылад, кіраваннем інфармацыяй і працай з кампутарам.

АК-19. Валодаць метадычнымі ведамі і даследчымі ўменнямі, якія забяспечваюць рашэнне задач інавацыйна-метадычнай і навуковай дзейнасці.

СЛК-1. Валодаць якасцямі грамадзянскасці, развітым пачуццём патрыятызму.

СЛК-2. Валодаць высокай духоўнасцю.

СЛК-3. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння на аснове прынятых маральных і прававых нормаў, дэманструючы павагу і талерантнасць да іншай культуры.

СЛК-5. Валодаць навыкамі здароўезберажэння.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

СЛК-6. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

СЛК-8. Валодаць верай у сябе, у свае сілы і здольнасці, у сваё пакліканне, у правільнасць выбару жыццёвага шляху.

СЛК-9. Аргументавана адстойваць асабістую пазіцыю ў дачыненні да сучасных працэсаў у галіне музычнага мастацтва.

СЛК-10. Актыўна ўдзельнічаць у творчых мерапрыемствах.

ПК-1. Прафесійна спяваць, артыстычна рухацца.

ПК-2. Ствараць мастацкую інтэрпрэтацыю музычнага твора, валодаць ведамі заканамернасцяў метадаў працы над вакальным творам, падрыхтоўкі да публічнага выступлення.

ПК-4. Публічна выконваць самастойна падабраны і вывучаны рэпертуар, які ўключае творы розных эпох, жанраў і стыляў, фарміраваць канцэртную праграму.

ПК-5. Сістэматычна працаваць над ростам выканальніцкага майстэрства.

ПК-9. Выкладаць спецыяльныя дысцыпліны для розных узроставых катэгорый, якія навучаюцца на ўзроўні, адпаведным патрабаванням сучаснага вакальнага мастацтва, пастаянна вывучаючы перадавы педагагічны і выканальніцкі вопыт і творча яго выкарыстоўваючы.

ПК-10. Прымяняць метады псіхолага-педагагічных навук і вынікі даследаванняў у галіне агульнай і музычнай педагогікі ў сваёй дзейнасці, улічваць псіхалагічныя асаблівасці навучэнцаў і практыкаваць індывідуальны падыход да вырашэння мэтаў і задач навучання і выхавання.

ПК-11. Выкарыстоўваць сучасныя методыкі і адукацыйныя тэхналогіі для выбару аптымальнай стратэгіі навучання. Прымяняць інавацыйныя тэхналогіі навучання, мультымедыйныя тэхналогіі, электронныя падручнікі, фоназапісы.

ПК-18. Арганізоўваць працу навукова-метадычных канферэнцый па праблемах вывучэння і захавання народна-песенных традыцый.

ПК-19. Удзельнічаць у культурным жыцці грамадства, ствараючы творчае і адукацыйнае асяроддзе з мэтай папулярызацыі музычнага мастацтва ў шырокіх колах грамадства.

ПК-22. Распрацоўваць і рэалізоўваць уласныя і (або) сумесныя з музыкамі-выканаўцамі іншых адукацыйных арганізацый і ўстаноў культуры асветніцкія праекты, у тым ліку, і з выкарыстаннем магчымасцяў радыё, тэлебачання, інтэрнэту.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ПК-23. Арганізоўваць гастрольна-канцэртную дзейнасць творчых калектываў і салістаў, весці перамовы па арганізацыі выканальніцкай дзейнасці.

ПК-31. Аналізаваць сучасны стан, перспектывы і напрамкі захавання і развіцця народна-песеннай творчасці.

ПК-32. Ажыццяўляць нагляд за ўмовамі бытавання розных відаў і жанраў песеннага фальклору з мэтай яго аховы і пераемнасці.

*Мэты вучэбнай дысцыпліны "Сольныя спевы":*

- засваенне практычных навыкаў сольных спеваў у беларускай народнай манеры выканання;
- азнаямленне з песеннымі традыцыямі розных рэгіёнаў Беларусі;
- авалоданне акцёрскім майстэрствам і элементамі народнай харэаграфіі;
- фарміраванне музычнага густу і творчага падыходу ў стварэнні мастацкага вобраза народнай песні;
- выхаванне творчай асобы.

*Асноўныя задачы вучэбнай дысцыпліны:*

- вырашэнне пытанняў ідэйна-выхаваўчай работы (эстэтычнае, маральнае, патрыятычнае выхаванне студэнтаў);
- прафесійнае авалоданне тэхнікай спеваў у народнай манеры;
- засваенне методыкі навучання народным спевам.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны "Сольныя спевы" студэнт павінен *ведаць:*

- механізм гуказдабывання і гукавядзення ў народнай манеры спеваў;
- тэхніку правільнага песеннага дыхання;
- народна-песенныя выканальніцкія прыёмы;
- тэхніку засваення народнай манеры спеваў;
- рэгіянальныя асаблівасці народна-песеннага выканальніцтва;

*умець:*

- свабодна і прафесійна валодаць народнай манерай спеваў;
- карыстацца вакальна-тэхнічнымі сродкамі народнай манеры спеваў;
- выкарыстоўваць сродкі мастацкай выразнасці для перадачы зместу вакальнага твора, які выконваецца;
- выконваць творы "а капэлла" і з суправаджэннем;
- карыстацца прынцыпамі падбору рэпертуару;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*валодаць:*

- тэхнікай вакальнага выканальніцтва (пеўчай устаноўкай дыханнем на апоры, дыкцыйнымі навыкамі, навыкамі дакладнай і яснай артыкуляцыі, роўнасцю гучання голасу на працягу ўсяго дыяпазону голасу);
- навыкамі мастацкай выразнасці выканання: праца над словам, раскрыццё мастацкага зместу і выяўленне стылістычных асаблівасцяў твора (фразіроўка, нюансіроўка, агогіка, прыёмы ўваходжання ў музычны вобраз, сцэнічная, мімічная выразнасць).

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Сольныя спевы” адведзена ўсяго 1172 гадзіны, з іх 510 гадзін – аўдыторныя заняткі (індывідуальныя).

Рэкамендаваныя формы кантролю ведаў студэнтаў – залік, экзамены.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны ў вучэбную дысцыпліну*

Роля вучэбнай дысцыпліны «Сольныя спевы» ў прафесійнай падрыхтоўцы студэнтаў у якасці артыстаў і салістаў хору, ансамблю. Змест, мэта, задачы вучэбнай дысцыпліны. Сувязь вучэбнай дысцыпліны «Сольныя спевы» з іншымі спецыяльнымі прадметамі. Сольны спеў, як від музычнага мастацтва.

## Раздзел І. Развіццё практычных навыкаў сольных спеваў у народнай манеры

### *Тэма 1. Вызначэнне тыпу і характару голасу, тэмпераменту, артыстычных і музычных дадзеных, індывідуальных недахопаў выканаўцы*

Засваенне пеўчай установкі і развіццё правільных навыкаў спеваў: мяккай атакі гуку, плаўнага і роўнага гукавядзення, дакладнай перадачы мелодыі (рытму, вышыні гуку, фразіроўкі, эканомнай артыкуляцыі, натуральнага вымаўлення слоў).

### *Тэма 2. Вызваленне галасавога апарату ад напружанага гучання*

Фарміраванне свабодных рухаў ніжняй сківіцы. Атака гуку. Тры тыпы атакі гуку. Засваенне мяккай, цвёрдай і прыдыхальнай атак гуку. Авалодванне метадамі народнага выканальніцтва. Засваенне ўсіх відаў атак: мяккай, цвёрдай, прыдыхальнай. Праца над мастацкім вобразам.

### *Тэма 3. Набыццё навыкаў правільнага пеўчага дыхання*

Дыханне пеўчае і фізіялагічнае: агульныя рысы і адрозненні. Засваенне навыкаў фарміравання апоры дыхання. Развіццё навыкаў апоры гуку. Авалодванне рознымі тыпамі дыхання. Ніжнярэберна-дыяфрагмальны тып дыхання. Практыкаванні, якія садзейнічаюць умацаванню дыхальных мышцаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 4. Удасканаленне дыкцыі, праца над словам*

Знаёмства з асаблівасцямі вымаўлення галосных і зычных літар у спевах. Артыкуляцыйны апарат. Набыццё навыкаў свабоднай працай артыкуляцыйнага апарату. Фарміраванне дакладнай дыкцыі. Знаёмства з тэхнікай вымаўлення галосных і зычных літар у дыялектах розных рэгіёнаў Беларусі.

## Раздзел ІІ. Засваенне тэхнікі сольных спеваў і вакальнага майстэрства

### *Тэма 5. Развіццё практычных навыкаў спеваў*

Выпрацоўка чыстай інтанацыі. Засваенне роўнага і плаўнага гукавядзення на творах з невялікім дыяпазонам. Выпрацоўка навыкаў спеваў у народнай манеры ў межах квінты, сэксты, сэптымы для жаночых галасоў; у межах сэптымы, актавы для мужчынскіх.

### *Тэма 6. Развіццё груднога рэзаніравання*

Знаёмства з рэгістрамі голасу. Засваенне прыёмаў спеваў "адкрытым" гукам. Праца над высокай пазіцыяй гуку; удасканаленне працы над дыханнем і плаўным гукавядзеннем. Выкарыстанне практыкаванняў на развіццё груднога рэзаніравання.

### *Тэма 7. Паступовае развіццё і пашырэнне дыяпазону*

Авалодванне рэгістравымі пераходамі. Ускладненне вакальных практыкаванняў (папеўкі больш шырокага дыяпазону, скачкі, розныя рытмічныя малюнкі, складаныя групоўкі нот, спалучэнні гукаў і складоў).

### *Тэма 8. Згладжванне рэгістравых пераходаў голасу*

Засваенне прыёмаў развіцця дыяпазону. Удасканаленне вакальнай тэхнікі пры дапамозе практыкаванняў па выраўноўванні галосных па ўсім дыяпазоне, развіцці гібкасці і рухомасці голасу. Спевы складаных практыкаванняў для развіцця вакальнай тэхнікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел III. Засваенне агульных і спецыфічных прыёмаў гукаўтварэння

### *Тэма 9. Авалоданне народна-выканальніцкімі прыёмамі*

Засваенне элементаў пластыкі, гульні. Уключэнне ў рэпертуар народных песень розных рэгіёнаў Беларусі з мэтай авалодання рэгіянальнымі выканальніцкімі прыёмамі (народныя мелізмы, спады голасу, агаласоўкі зычных, слізганні, глісанда і інш.).

### *Тэма 10. Знаёмства з характэрнымі прыёмамі гукаўтварэння*

Авалодванне метадамі народнага выканаўства. Засваенне ўсіх відаў атак: мяккай, цвёрдай, прыдыхальнай. Праца над мастацкім вобразам.

### *Тэма 11. Засваенне асаблівасцей дыялектаў*

Авалодванне спецыфікай вымаўлення. Перайманне народна-выканальніцкіх прыёмаў. Асаблівасці рэгіянальных гаворак, стыляў і азнаямленне з імі.

## Раздзел IV. Развіццё і ўдасканаленне вакальнай тэхнікі

### *Тэма 12. Удасканаленне вакальнай тэхнікі*

Пашырэнне дыяпазону, згладжванне рэгістравых пераходаў, развіццё груднога і галаўнога рэзаніравання. Выкарыстанне прыёмаў прыкрыцця гуку на верхніх нотах дыяпазону. Выкананне твораў у нюансах фортэ і піяна з улікам, унутры іх дынамікі, у павольным, памераным, памерана-хуткім і хуткім тэмпах, уменне філіраваць гук. Удасканаленне дыкцыі і артыкуляцыі, апоры дыхання.

### *Тэма 13. Авалоданне сродкамі мастацкай выразнасці*

Праца над фразіроўкай, філіроўкай гуку. Выкарыстанне сродкаў мастацкай выразнасці (дынамічных адценняў, нюансаў, тэмпу і інш.)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

для перадачы зместу твора, які выконваецца. Музычна-тэарэтычны аналіз твораў, якія спявае выканаўца.

### *Тэма 14. Праца над стварэннем мастацкага вобраза народнай песні*

Засваенне навыкаў імправізацыі. Выкарыстанне спецыфічных метадаў і кірункаў у інтэрпрэтацыі народнай песні. Пашырэнне дыяпазону груднога гучання ў межах сэптымы, актавы для жаночых галасоў; актавы, дэцымы для мужчынскіх галасоў; ужыванне складаных практыкаванняў для развіцця дыяпазону, рухомасці голасу, палётнасці, яскравасці.

### *Тэма 15. Выяўленне творчай індывідуальнасці выканаўцы*

Арганізацыя самастойнай работы спевака па падборы рэпертуару, стварэнні канцэртнай праграмы. Удасканаленне выканальніцкага і акцёрскага майстэрства.

## Раздзел V. Фарміраванне творчай асобы студэнта-спевака – выканаўцы народнай песні

### *Тэма 16. Фарміраванне артыста-спевака ў межах ВНУ*

Выхаванне творчай асобы выканаўцы народнай песні і яго ідэйна-мастацкага вобраза. Засваенне прыёмаў вакальна-выканальніцкай тэхнікі, паглыбленне ведаў у сферы народна-песеннага выканальніцтва.

### *Тэма 17. Удасканаленне вакальна-тэхнічных навыкаў і ўменняў*

Спевы складаных практыкаванняў на дыкцыю, дыханне, развіццё дыяпазону, рухомасць голасу. Пошук свайго выканальніцкага крэда. Удасканаленне вакальнай тэхнікі. Асэнсаванасць інтанаванне музычна-паэтычнага тэксту, выразнасці і вобразнасці выканання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## *Тэма 18. Падбор складанага і разнастайнага рэпертуару. Падрыхтоўка да дзяржаўнага экзамену*

Актыўная канцэртная дзейнасць. Арганізацыя самастойнай работы па стварэнні мастацкага вобраза песні, падборы рэпертуару, складанні канцэртнай праграмы. Развіццё прафесіяналізму ў народна-песенным выканальніцтве.

На дзяржаўны экзамен выносяцца 10–12 твораў: народныя песні аўтэнтычныя і ў апрацоўцы, з суправаджэннем і без суправаджэння, арыгінальныя аўтарскія творы. Экзаменацыйная праграма павінна адпавядаць патрабаванням вучэбнага плана па падрыхтоўцы выканаўцаў народнай песні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назвы тэм | | Колькасць гадзін | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Індывід. заняткі | КСР | Форма кантролю |
| Уводзіны | | 1 | | | |
| **Раздзел І. Развіццё практычных навыкаў сольных спеваў у народнай манеры** | | | | | |
| 1 | ***Тэма 1.*** Вызначэнне тыпу і характару голасу, тэмпераменту, артыстычных і музычных дадзеных, індывідуальных недахопаў выканаўцы | | 2 | | |
| 2 | ***Тэма 2.*** Вызваленне галасавога апарату ад напружанага гучання | | 10 | 8 | паказ на уроку |
| 3 | ***Тэма 3.*** Набыццё навыкаў правільнага пеўчага дыхання | | 40 | 8 | тэхнічны залік |
| 4 | ***Тэма 4.*** Удасканаленне дыкцыі, праца над словам | | 42 | 4 | экзамен |
| **Раздзел ІІ. Засваенне тэхнікі сольных спеваў і вакальнага майстэрства** | | | | | |
| 6 | ***Тэма 5.*** Развіццё практычных навыкаў спеваў | | 93 | | залік |
| 7 | ***Тэма 6.*** Развіццё груднога рэзаніравання | | 36 | 6 | тэхнічны залік |
| 8 | ***Тэма 7.*** Паступовае развіццё і пашырэнне дыяпазону | | 18 | 4 | паказ на уроку |
| 9 | ***Тэма 8.*** Згладжванне рэгістравых пераходаў голасу | | 18 | 14 | экзамен |
| **Раздзел ІІІ. Засваенне агульных і спецыфічных прыёмаў гукаўтварэння** | | | | | |
| 11 | ***Тэма 9.*** Авалоданне | | 18 | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | народна-выканальніцкімі прыёмамі | | | | |
| 12 | ***Тэма10.*** Знаёмства з характэрнымі прыёмамі гукаўтварэння | | 18 | 5 | вуснае апытанне |
| 13 | ***Тэма 11.*** Засваенне асаблівасцей дыялектаў | | 18 | 5 | тэхнічны залік |
| **Раздзел IV. Развіццё і ўдасканаленне вакальнай тэхнікі** | | | | | |
| | ***Тэма 12***. Удасканаленне вакальнай тэхнікі | | 40 | 5 | вакальны трэнінг |
| | ***Тэма 13.*** Авалоданне сродкамі мастацкай выразнасці | | 34 | 5 | экзамен |
| | ***Тэма 14***. Праца над стварэннем мастацкага вобраза народнай песні | | 36 | 5 | рэферат |
| | ***Тэма 15.*** Выяўленне творчай індывідуальнасці выканаўцы | | 10 | | экзамен |
| **Раздзел V. Фарміраванне творчай асобы студэнта-спевака – выканаўцы народнай песні** | | | | | |
| | ***Тэма 16.*** Фарміраванне артыста-спевака ў межах ВНУ | | 18 | 10 | канцэрт-справаздача |
| | ***Тэма 17.*** Удасканаленне вакальна-тэхнічных навыкаў і ўменняў | | 28 | 5 | сцэнарны-план |
| | ***Тэма 18.*** Падбор складанага і разнастайнага рэпертуару. Падрыхтоўка да дзяржаўнага экзамену | | 30 | | экзамен |
| Усяго: | | 1 | 425 | 84 | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*


1. *Беларускі* фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / укл. В.Д. Ліцвінка, Г.Д. Кутырова. – Мн.: Універсітэцкае, 1995. – 250 с.
2. *Беларускі* фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Гомельская вобласць / укл. В.А. Захарава, Р.М. Кавалёва, В.Д. Ліцвінка. – Мн.: Універсітэцкае, 1989. – 384 с.
3. *Беларускія* народныя танцавальныя песні: рэпертуарны зборнік / укл. М.А. Козенка. – Мн., 1988. – 112 с.
4. *Варфаламеева, Т.Б.* Песні Беларускага Панямоння / Т.Б. Варфаламеева. – Мн.: Бел.навука, 1980. – 220 с.
5. *Веснавыя* песні / рэд. К.П. Кабашнікаў. – Мн.: Навука і тэхніка, 1979. – 608 с.
6. *Вянок* беларускіх народных песень / запіс У. Раговіча. – Мн.: Навука і тэхніка, 1988. – 432 с.
7. *Дарога* ля жыта: песні бел. кампазітараў на вершы В.А. Жуковіча / укл. В.А. Жуковіч. – Мн.: Беларусь, 2001. – 144 с.
8. *Елатов, В.И.* Песни восточно-славянской общности / В.И. Елатов. – Мн.: Наука и техника, 1977. – 245 с.
9. *Жартоўныя* песні / рэд. А.С. Фядосік. – Мн.: Навука і тэхніка, 1974. – 340 с.
10. *Жніўныя* песні / рэд. А.С. Фядосік. – Мн.: Навука і тэхніка, 1974. – 348 с.
11. *Кузняцоў, І.І.* Звіняць над краем песні / І.І. Кузняцоў. – Мн.: Беларусь, 1979. – 79 с.
12. *Купальскі спеўнік* : метадычны дапаможнік // аўтар-укл. Т.А. Пладунова. – Мінск : Інстытут культуры Беларусі, 2013. – 160 с.
13. *Мажэйка, З.Я.* Песні Беларускага Паазер’я / З.Я. Мажэйка. – Мн.: Навука і тэхніка, 1981. – 493 с.
14. *Мажэйка, З.Я.* Песні Беларускага Падняпроўя / З.Я. Мажэйка, Т.Б. Варфаламеева. – Мн.: Бел. навука,1999. – 276 с.
15. *Можейко, З.Я.* Песни Белорусского Полесья / З.Я. Можейко. – М.: Сов. композитор, 1983. – Вып. 1. – 184 с.
16. *Можейко, З.Я.* Песни Белорусского Полесья / З.Я. Можейко. – М.: Сов. композитор, 1984. – Вып. 2. – 181 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

17. *Песні* Беласточчыны / А.С. Фядосік. – Мн.: Бел. навука, 1997. – 237 с.

18. *Равенскі, М.* Збор твораў : Беларускія народныя песні / Мікола Равенскі; рэдкал.: І. Алоўнікаў [і. інш.]. – Мінск: Тэхналогія, 2008. – 191 с.

19. *Раговіч, У.І.* Песенны фальклор Палесся. Песні святочнага календара / У.І. Раговіч. – Мн.: Чатыры чвэрці, 2001. – Т. 1. – 526 с.

20. Разам з Радзімай : песні беларускіх кампазітараў і паэтаў / уклад. Г.В. Марчку. – Мінск : Народная асвета, 2016. – 327 с.

21. *Русские* песни из репертуара Л. Руслановой. – М.: Музыка, 1973. – 95 с.

22. *Салавей* спявае / укл. С.К. Ярохіна. – Мн.: Беларусь, 1990. – 160 с.

23. *Соколова, Н.М.* Гармония души : песни / Нина Соколова. – Минск : Печенко А.Г., 2010. – 79 с.

24. *Традыцыйная* мастацкая культура беларусаў: у 6 т. / Т.Б. Варфаламеева, В.І. Басько, М.А. Козенка [і інш.]. – Мн.: Бел. навука, 2001. – Т. 1: Магілёўскае Падняпроўе. – 797 с.

25. *У карагодзе* мы былі. Беларускія народныя танцавальныя песні / укл. М.А. Козенка. – Мн., 1988. – 112 с.

26. *Холупава, Л.І.* Пастаноўка голасу і вакальны ансамбль: вучэб. дапам. / Л.І. Холупава, І.М.Грамовіч, Л.Л.Ражкова. – Мн.: Бел. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2008. – 189 с.

27. *Цітавец, І.* Ёсць любоў у мяне…: Зб. песень. –Мн.: Рэд.часоп. “Адукацыя і выхаванне”, 1999. – 321 с.

28. *Чырвоная каліна* : зборнік твораў самадзейных кампазітараў Брэстчыны : у дапамогу кіраўнікам вакальна-харавых калектываў / уклад. М. Дз. Аласюк [і інш.]. – Брэст : Альтэрнатыва, 2012. – 48 с.

*Дадатковая*

1. *Варфоломеева, Т.Б.* Северобелорусская свадьба / Т.Б. Варфоломеева. – Мн.: Наука и техника, 1988. – 154 с.

2. *Вяселле:* абрад / укл. К.А. Цвірка. – Мн.: Бел. навука. – 2004. – 683 с.

3. *Дмитриев, Л.Б.* Основы вокальной методики / Л.Б. Дмитриев. – М.: Музыка, 2000. – 367 с.

4. *Елатов, В.И.* Песни восточно-славянской общности / В.И. Елатов. – Мн.: Наука и техника, 1977. – 245 с.

5. *Емельянов, В.В.* Развитие голоса. Координация и тренаж / В.В. Емельянов. – СПб.: Лань, 1997. – 192 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. *Калугина, Н.В.* Методика работы с русским народным хором: учебник для муз. вузов / Н.В. Калугина. – М.: Музыка, 1977. – С. 71.
7. *Крывіцкі, А.А.* Сучасная беларуская літаратурная мова і народныя гаворкі / А.А. Крывіцкі. – Мн.: Т-ва па распаўсюджанні паліт. і навук. ведаў БССР, 1961. – 40 с.
8. *Малышева, Н.М.* О пении / Н.М. Малышева. – М.: Сов. композитор, 1988. – 135 с.
9. *Мешко, Н.К.* Искусство народного пения: практ. рук-во и методика обучения искусству народного пения: учеб. пособие для педагогов и студентов сред. и высш. учеб. заведений, руководителей и артистов народных хоров и ансамблей / Н.К. Мешко. – М., 2000. – Вып. 2. – С. 8.
10. *Мешко, Н.К.* Искусство народного пения: практ. рук-во и методика обучения искусству народного пения / Н.К. Мешко. – М.: ЛУЧ, 2000. – Ч. 2. – 80 с.
11. *Руднева, А.В.* Русский народный хор и работа с ним / А.В. Руднева. – М.: Сов. Россия, 1974. – С. 49.
12. *Савельева, В.П.* Проблемы вокального обучения руководителей народных хоров / В.П. Савельева // Вопросы хорового образования: сб. тр.; М-во культуры РСФСР. – М.: Гос. муз.-пед. ин-т, 1985. – Вып. 77. – С. 120.
13. *Шамина, Л.В.* Работа с самодеятельным хоровым коллективом / Л.В. Шамина. – М.: Музыка, 1983. – 176 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# КРЫТЭРЫІ АЦЭНАКІ ВЕДАЎ

1 бал – адсутнасць ведаў значнай часткі тэарэтычнага матэрыялу. Студэнт не валодае выканальніцкімі прыёмамі, фальшыва інтануе мелодыю, мае не развіты дыяпазон голасу. Не валодае навыкамі спеваў без акампанементу.

2 балы – студэнт здольны да адрозьненьня элементаў музычнай мовы, выканальніцкіх прыёмаў, аднак слых, памяць, рытм і вакальныя дадзеныя развітыя слаба, адсутнічае артыстызм.

3 балы – няпэўнае выкананне праграмы. Мае прыродныя вакальна-музычныя дадзеныя, але адсутнічае каардынацыя паміж слыхам і голасам, што праяўляецца пры выкананні ў фальшывай інтанацыі, дыяпазон голасу вузкі; недастатковае валоданне музычнай мовай, сцэнічныя дадзеныя недастатковыя.

4 балы – выкананне праграмы на ўзроўні ўласных перажыванняў, недастаткова асэнсаванае, але студэнт мае сцэнічныя дадзеныя. Слых, памяць, рытм, дыяпазон голасу развіты недастаткова. Выкананне твора без суправаджэння не выразнае, эмацыйна скаванае.

5 балаў – выкананне праграмы асэнсаванае адпаведна паэтычнаму тэксту. Студэнт мае даволі добрыя вакальныя, музычныя і сцэнічныя дадзеныя. Існуе каардынацыя паміж слыхам і голасам. Выканаўца валодае ўласнай выканальніцкай тэхнікай і ўмее карыстацца сродкамі музычнай выразнасці. Дыяпазон голасу недастаткова развіты.

6 балаў – выкананне праграмы ўпэўненае. Добрыя вакальныя і музычныя дадзеныя, развіты дыяпазон голасу. Не хапае выразнасці і эмацыйнасці пры выкананні твораў, аднак, стаўленне да мастацкага вобразу ўсвядомленае. У дастатковай ступені валодае навыкам спеваў без суправаджэння.

7 балаў – выкананне праграмы выразнае, эмацыянальнае. Вакальныя і музычныя дадзеныя вельмі добрыя, развіты маўленчай апарат. Студэнт здольны дакладна падабраць неабходныя выканальніцкія сродкі выразнасці для перадачы мастацкага вобраза. Валодае навыкам спеваў без суправаджэння і ў суправаджэнні акустычных інструментаў.

8 балаў – выдатнае выкананне праграмы, эмацыянальнае. Студэнт выкарыстоўвае розныя спосабы развіцця музычнай думкі ў працэсе выканання. Вельмі добрыя прыродныя вакальныя і музычныя дадзеныя, валоданне голасам, сцэнічныя дадзеныя адказваюць профілю абранай спецыяльнасці ў поўнай меры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

9 балаў – высокія музычныя здольнасці, дакладнае вакальна-інтанацыйнае выкананне праграмы; асэнсаванае стварэнне мастацкага вобраза і самастойнае яго ўвасабленне ў працэсе выканальніцкай дзейнасці. Выкананне адрозніваецца артыстычнасцю, эмацыянальнасцю і выразнасцю. Добра развіты навык спеваў без суправаджэння і ў суправаджэнні акустычных музычных інструментаў.

10 бадаў – выкананне праграмы адрозніваецца яркай індывідуальнасцю, творчай свабодай і артыстычнасцю. Студэнт у поўнай меры валодае вакальнай і слыхавой культурай. Развіты маўленчай апарат і дыяпазон голасу. Выкананне твора без суправаджэння і з суправаджэннем адрозніваецца глыбінёй музычнага мыслення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДАВАНЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

***Асноўнымі сродкамі дыягностыкі*** з’яўляюцца:

– тэхнічныя залікі, залікі, экзамены (у працэсе якіх вывучаны матэрыял прад’яўляецца ў выглядзе паказа ў класе, канцэртнага выканання),

– тэматычны фестываль-канцэрт;

– конкурс на лепшую інтэрпрэтацыю твора (народная песня) ;

– калёквіум (праверка музычнай тэрміналогіі);

– напісанне анатацыі на творы, якія выконвае спявак.

Для кантролю і самакантролю ведаў і ўменняў студэнтаў па дысцыпліне “Сольныя спевы” ўжываецца:

– кантроль зыходных ведаў, уменняў, навыкаў студэнта;

– бягучы кантроль ведаў, уменняў, навыкаў, што атрымліваюцца студэнтам;

– выніковы кантроль атрыманых студэнтам ведаў, уменняў, навыкаў.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ І ВЫКАНАННІ САМАСТОЙНАЙ ПРАЦЫ СТУДЭНТАЎ

Для якаснага засваення практычнага матэрыялу па вучэбнай дысцыпліне “Сольныя спевы” студэнту неабходна выконваць вызначаны аб’ём самастойнай працы ў які ўваходзяць наступныя заданні:

- самастойная праца над вакальна-тэхнічнымі навыкамі вучэбнага рэпертуара па вучэбнай дысцыпліне ў адпаведнасці з вучэбнай праграмай;
- праца з вучэбнай нотна-музычнай, навукова-метадычнай, хрэстаматыйнай вакальна-педагагічнай літаратурай ў аб’ёме, прадугледжаным вучэбным планам і праграмай;
- падбор і правядзенне 3-5 практыкаванняў на розныя віды вакальнай тэхнікі;
- складанне кароткага аповеду пра музычныя творы, якія знаходзяцца ў “працы” за занятках па вучэбнай дысцыпліне “Сольныя спевы”;
- вылучэнне і развучванне ў вакальным творы найбольш цяжкіх ў вакальна-тэхнічным дачыненні месцаў і прапрацоўка спосабаў іх засваення і развучвання;
- развучыць вакальны твор і зрабіць аўдыё (відэа) запіс свайго выканання. Праслухаць і прааналізаваць вартасці і недахопы выканання;
- выбраць вакальны твор для выканання пад уласны акампанемент і развучыць вакальную і інструментальную партыі паасобку;
- наведаць шэраг канцэртаў і майстар-класаў спевакоў – выканаўцаў народнай песні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ